**Паўловіч, А.** Дарогі мужнасці / А. Паўловіч // Лепельскі край. — 2003. — 14 лют. — С. 1.

# ДАРОГІ МУЖНАСЦІ

*У шматдзетнай сям'і Вашкевічаў з вёскі Вілы Васіль трэці. Рос кемлівым, працавітым і паслухмяным. Старанна вучыўся ў Слабадской сярэдняй школе, дапамагаў бацькам па гаспадарцы. Ён з тых вясковых руплівцаў, якія змалку ўмеюць выконваць няхітрыя, аднак патрэбныя сялянскія справы. У яго юнацкіх руках паслухмянымі былі і каса, і плуг, і сякера.*

Пасля школы паступіў у гідрамеліярацыйны тэхнікум.

Пад той час старэйшыя стрыечныя браты Васіль і Віктар ужо пабывалі ў Афганістане. Калі вярнуліся дамоў, шмат расказвалі аб службе. І было яму лёсам наканавана пабываць у тым пекле.

Васіля прама з тэхнікумаўскай парты прызвалі ва Узброеныя Сілы Савецкага Саюза. Прайшоў вучэбку ў Фергане, у якой дасканала авалодаў спецыяльнасцю вадзіцеля. Ці не на другі дзень увесь выпуск вучэбкі перакінулі ў Афганістан.

– Здароў, Афган! – жартавалі «салагі». Не ведалі яны, што чакае іх небяспечная служба.

Асобны батальён матэрыяльнага забеспячэння (АБМ) базіраваўся ў Кабуле. Радавому В. Вашкевічу даручылі вадзіць бартавы трохвосны КАМаз.

Перавозілі прадукты, боепрыпасы з Паліхумрынскай і Хаўратонскай аптовых баз. Адна знаходзілася за 250 кіламетраў, другая – за 500. Дарога ішла цераз легендарны Саланг. Яе называлі дарогай жыцця і смерці. У гарах на вышыні 3000 метраў над узроўнем мора транспартнікаў падпільноўвалі «духі». Абстрэльвалі з гранатамётаў і аўтаматаў.

Кароткія зборы, і вось калона з 30 загружаных машын рухаецца з базы ў Кабул. Па серпанціну ўсё вышэй і вышэй узнімаецца на перавал. Калона рухаецца ў суправаджэнні трох БТР і трох зенітных установак. «Духі» напалі за адным з крутых паваротаў. З-пад ураганнага агню ўдалося вывесці ўсяго некалькі машын. Вашкевіч вывеў сваю таксама. Вярнуліся ў свой АБМ. Кароткі адпачынак, і зноў у няблізкую складаную дарогу пад магчымы абстрэл у гарах.

– Аб чым успаміналася часцей за ўсё ў Афганскім пекле? – цікавімся ў В. Вашкевіча.

– Аб доме. І яшчэ аб каханай дзяўчыне, – шчыра прызнаецца.

Ад Іры часта прыходзілі пісьмы. У кожным – цеплыня і каханне. Саграваліі падтрымлівалі яны салдата на працягу паўтарагадовай службы пад кулямі. Дамоў вярнуўся жывым і здаровым з зіхатлівымі савецкімі і афганскімі ўзнагародамі. У іх ліку медаль «За баявыя заслугі».

Адвячоркам была сустрэча з Ірай. Гарачыя абдымкі, пацалункі. А потым? Ну, вядома, было вяселле, па-вясковаму багатае на частаванне, песні.

Сямейнае жыццё склалася ўдала. В. Вашкевіч уладкаваўся вадзіцелем у ДРБУП-202. Маладажонам выдзелілі двухпакаёвую кватэру ў Лепелі. Іра працуе настаўніцай у Слабадской сярэдняй школе. У сям'і двое дзяцей – дачка Віка і сын Максім.

**А. Паўловіч**